


# Вікі дапаможнік

*Кіруй ведамі!*

клясычны правапіс

falanster.by

# Зьмест

Як працуе Вікіпэдыя.......**4**
Уліковы запіс карыстальніка.......**10**
Карыстальніцкі інтэрфэйс.......**15**
Стварэньне артыкулаў.......**19**
Вікі-разьметка.......**28**
Заліцьцё здымкаў (праект Wikimedia Commons).......**32**
Як кантактаваць зь вікі-супольнасьцю Беларусі.......**40**
Ліцэнзіі матэрыялаў Вікіпэдыі CC BY-SA.......**42**
Кантакты.......**46**




Прывітаньне! Мяне клічуць Вікі.
Я карыстаюся Вікіпэдыяй, калі мне трэба даведацца больш пра нейкую тэму. Але мне цікава ведаць, хто ж піша гэтыя артыкулы?
Я чула, што кожны можа рэдагаваць Вікіпэдыю, ці магу я зрабіць гэта таксама? Якім чынам?

*«Уявіце сабе сьвет,*
*у якім кожны чалавек*
*на плянэце мае вольны доступ*
*да ўсіх ведаў чалавецтва!»*
*Джымі Ўэйлз*

# Як працуе Вікіпэдыя

## Што такое Вікіпэдыя ўвогуле, паводле якіх прынцыпах працуе

**Вікіпэдыя** (па-ангельску: *Wikipedia*; *вікі* (тэхналёгія супольнага стварэньня сайтаў – ад *wiki* < *анг. quick ʻхуткаʼ*) + *энцыкляпэдыя*) – шматмоўная агульнадаступная інтэрнэт-энцыкляпэдыя свабоднага распаўсюду, якая ствараецца супольнай працай добраахвотных аўтараў і каардынуецца непрыбытковай арганізацыяй **Фундацыяй Вікімэдыі**, якая знаходзіцца ў **Сан-Францыска (Каліфорнія)**. Распачатая **Джымі Ўэйлзам** і **Лэры Сэнгерам** у **2001** годзе, Вікіпэдыя – найбуйнейшы і самы папулярны даведнік у інтэрнэце, які вельмі хутка разьвіваецца.

Вікіпэдысты ствараюць найбуйнейшае сховішча вольных ведаў у сьвеце.

Усё, што ёсьць у Вікіпэдыі, было напісанае такімі ж людзьмі, як Вы. І сапраўды, Вікіпэдыя перастане быць найбуйнейшай онлайн-энцыкляпэдыяй у сьвеце безь людзей, якія будуць рабіць далейшы ўнёсак інфармацыі, выяваў і зьвестак.

Многія ўдзельнікі, або вікіпэдысты, імкнуцца забясьпечыць веды кожнаму бескаштоўна. Вось чаму людзі з усяго сьвету выкарыстоўваюць свой вольны час дзеля захаваньня й паляпшэньня якасьці артыкулаў у Вікіпэдыі.

**Вікіпэдыя дае кожнаму магчымасьць свабодна абменьвацца ведамі.**

Кароткая спасылка

Вікіпэдыя:Пра Вікіпэдыю

Знайшлі памылку і маеце што дадаць да артыкулу? Будзьце рашучымі!

Грунтоўныя прынцыпы, якімі карыстаецца Вікіпэдыя, былі гістарычна абагульненыя суполкай рэдактараў у **пяць «слупоў»**:

Сіні слуп (1: Энцыкляпэдыя) **Вікіпэдыя – гэта энцыкляпэдыя**, якая ўвабрала ў сябе элемэнты агульных і спэцыялізаваных энцыкляпэдыяў, альманахаў і геаграфічных даведнікаў. Зьмест мусіць быць пацьверджаны цытатамі з крыніцаў, вартых даверу. Вікіпэдыя – ня месца для публікацыі асабістых меркаваньняў удзельнікаў, асабістага досьведу або ўласных перакананьняў.

Зялёны слуп (2: НПГ) **Вікіпэдыя мае нэўтральны пункт гледжаньня.** Гэта значыць, што мы імкнемся да непрадузятасьці кожнага артыкулу. У некаторых выпадках гэта вымагае прывядзеньня некалькіх пунктаў гледжаньня з адпаведным кантэкстам, каб паказаць шматграннасьць прадмету. Пры гэтым ня варта адзначаць які-небудзь з варыянтаў як «лепшы пункт гледжаньня» або «непахісную ісьціну».

Жоўты слуп (3: Вольны) **Вікіпэдыя мае вольны зьмест**, які кожны ўдзельнік можа рэдагаваць і распаўсюджваць. У сувязі з вольным ліцэнзаваньнем усяго зьместу Вікіпэдыі, ніводны ўдзельнік ня можа перашкаджаць рэдагаваньню і распаўсюджваньню артыкулаў. Адпаведна, усе ўнесеныя вамі выпраўленьні, у сваю чаргу, могуць быць бязьлітасна адрэдагаваныя ці перапрацаваныя суполкай і распаўсюджаныя ў любым выглядзе. У той жа час трэба заўсёды памятаць пра аўтарскае права і паважаць яго.

Аранжавы слуп (4: Ветлівасьць) **Вікіпэдыстам варта мець паміж сабой ветлівыя і ўзаемапаважлівыя зносіны.** Паважайце і будзьце ветлівымі з Вашымі калегамі-вікіпэдыстамі, нават калі Вы ня згодныя зь імі. Прытрымлівайцеся этыкету і пазьбягайце асабістых выпадаў, абразаў, пагрозаў і агрэсіі. Будзьце адкрытымі і гасьціннымі.

Чырвоны слуп (5: Ігнаруйце ўсе правілы) **Вікіпэдыя ня мае нязьменных правілаў** за выключэньнем пяці, пададзеных тут. Будзьце рашучымі і ня бойцеся рабіць памылкі: атрымлівайце задавальненьне ад рэдагаваньня, бо ніхто не вымагае ад Вас стварэньня ідэальных артыкулаў, хоць да гэтага, несумненна, варта імкнуцца.
**Гэта пяты і самы важны слуп!**

Кароткая спасылка

Вікіпэдыя:Пяць слупоў

Выкарыстоўвайце кароткія спасылкі праз вакно **«Пошук»**.
Напр., ***Катэгорыя:Біялёгія, Вікіпэдыя:Вікідапаможнік***

*Але хто вырашае,*
*што будзе апублікаванае?*
*Галоўны рэдактар ці нехта іншы?*

**Зьмяняць існыя артыкулы ў Вікіпэдыі можа любы, хто мае доступ да інтэрнэту.** Кожны ўдзельнік Вікіпэдыі працуе на разьвіцьцё супольнасьці. І Вы можаце выступіць у ролі, якая Вам больш цікавая ў Вікіпэдыі:

### РЭДАКТАР

*Дадае інфармацыю да артыкулаў* з кнігаў, вэб-сайтаў, газэтаў і іншых крыніцаў, якія заслугоўваюць давер. Таксама ініцыюе стварэньне новых артыкулаў. Структуруе альбо вікіфікуе артыкулы, выкарыстоўваючы вікі-разьметку, якую лягчэй чытаць.

### КАРЭКТАР

*Паляпшае існыя артыкулы*, выпраўляе граматыку й стылістыку артыкулаў.

### ПАЧАТКОВЕЦ

*Робіць дробныя выпраўленьні.* Напрыклад, выпраўляе напісаньне словаў. Таксама ён прапаноўвае шляхі паляпшэньня артыкулу, паведамляючы пра гэта на старонцы абмеркаваньня артыкулу.



### ІЛЮСТРАТАР

*Загружае малюнкі, фатаздымкі*, мапы й візуальныя дапаможнікі, якія маюць дачыненьне да артыкулу, пры гэтым не забываючыся пра аўтарскія правы графічных матэрыялаў.

## НАГЛЯДЧЫК

*Выяўляе артыкулы з прадузятым стаўленьнем да напісанага і выпраўляе іх.* Назірае за зьменамі, унесенымі аўтарам, які парушыў прынцып нэўтральнасьці да прадмету ці аб’екту артыкулу; забясьпечвае фактычную дакладнасьць зьвестак у артыкуле і яго нэўтральнасьць.

## АДМІНІСТРАТАР

*Мае права абараняць і выдаляць старонкі.* А таксама мае адказнасьць – актыўна ўдзельнічаць у разьвіцьці Вікіпэдыі любымі іншымі спосабамі.

## АРГАНІЗАТАР ПАДЗЕЯЎ

*Ладзіць імпрэзы,* накіраваныя на разьвіцьцё Вікіпэдыі, узмацненьне й пашырэньне вікі-супольнасьці.

## МЭДЫЯ-АКТЫВІСТ

*Піша пра навіны й падзеі Вікіпэдыі* дзеля пашырэньня яе вядомасьці й разуменьня.

## ПЕРАКЛАДЧЫК

*Перакладае артыкулы* зь іншых моўных вэрсіяў на беларускую мову; ці пашырае веды пра Беларусь на іншых мовах.

Гэты пералік не вычарпальны, можна прыдумаць і іншыя заняткі, якія былі б карысныя Вікіпэдыі.

# Уліковы запіс карыстальніка




*Я жадаю дапамагчы людзям атрымаць вольны і бясплатны доступ да ведаў. Распавядзі мне больш. З чаго мне пачаць?*

Стварэньне **уліковага запісу карыстальніка** – добры першы крок, калі Вы пачынаеце рабіць унёсак у Вікіпэдыю. Рахунак дазваляе Вам:

- ствараць новыя артыкулы;
- запампоўваць выявы;
- пераносіць старонкі.

Вы таксама атрымаеце доступ да спэцыяльных функцыяў, такіх, як «**Мой сьпіс назіраньня**». Сьпіс назіраньня дазваляе Вам сачыць за артыкуламі, якія Вы адрэдагавалі і паставілі пазнаку цікавасьці да старонкі. Каб дадаць артыкул у сьпіс назіраньня, націсьніце на значок-зорачку ў верхняй частцы артыкулу.

Што яшчэ больш важна, такім чынам усе Вашыя зьмены ў артыкулах Вікіпэдыі запісваюцца пад імем Вашага рахунку, ідэнтыфікуючы Вашую дзейнасьць у Вікіпэдыі. Гэта дапаможа Вам узаемадзеяць зь іншымі людзьмі, якія рэдагуюць тыя ж артыкулы, што й Вы, і стаць надзейным **сябрам супольнасьці**.

Калі Вы прызвычаіцеся да Вікіпэдыі, то выявіце, што будзеце здольныя ўдзельнічаць у дыскусіях, і зможаце дапамагчы іншым у рэдагаваньні артыкулаў.

## Рэдагаваньне без рэгістрацыі

Вы можаце рэдагаваць Вікіпэдыю без рэгістрацыі. Тым ня менш, без выкарыстаньня рахунку Вашыя выпраўленьні будуць запісвацца пад Вашым IP-адрасам. Практыка сьведчыць пра тое, што супольнасьць **Вікіпэдыі схільная не давяраць выпраўленьням ананімаў.**

Калі вы забыліся, як нешта зрабіць ў Вікіпэдыі, знайдзіце любы артыкул, які ўтрымлівае тое, што вы жадаеце дадаць. Націснуўшы **«Рэдагаваць крыніцу»**, вы пяройдзеце на старонку рэдагаваньня вікі-тэксту і ўбачыце, як пабудаваны іншы артыкул. Па аналёгіі зможаце адрэдагаваць свой.

# Як стварыць рахунак карыстальніка

Стварыць уліковы запіс у Вікіпэдыі вельмі лёгка:

- Націсьніце на **«Стварэньне рахунку»** ў правым верхнім куце старонкі.
- Запоўніце поле **«Імя ўдзельніка»** (можна выкарыстаць нік).
- Абярыце сабе пароль.
- Націсьніце на спасылку **«Стварыць рахунак»**.

Калі Вы ствараеце ўліковы запіс карыстальніка, лепш запоўніць поле «Адрас электроннай пошты». У гэтым выпадку Вы зможаце аднавіць свой пароль, калі забудзеце яго.

## Кароткая спасылка

Вікіпэдыя:Як зарэгістравацца

*Гэта было хутка!*
*Цяпер я маю рахунак і магу ствараць якасныя артыкулы.*






# Асабістая старонка ўдзельніка

Дадаць інфармацыю пра сябе й свае інтарэсы можна на Вашай старонцы ўдзельніка. Кожны рахунак мае старонку ўдзельніка й старонку гутарак. Вы можаце знайсьці спасылкі на сваю старонку й гутаркі **ў правым верхнім куце экрана**. Каб перайсьці на Вашую старонку карыстальніка, трэба націснуць на Вашае імя карыстальніка, якое знаходзіцца побач са значком удзельніка. Потым націсьніце на кнопку **«Рэдагаваць крыніцу»**, каб напісаць пра сябе. Калі скончыце пісаць пра сябе, націсьніце на кнопку **«Захаваць старонку»** ў ніжняй частцы экрана.

Вы можаце напісаць пра сябе, свае спэцыяльныя веды й пазначыць Вашую цікавасьць, прыкладам, цікавасьць да тэматыкі ці да пэўных артыкулаў.

На старонцы карыстальніка можна разьмяшчаць розныя **шаблёны**, якія робяць профіль больш інфарматыўным
- {{Удзельнік:Шаблёны/Адміністратар}}, {{Удзельнік:Шаблёны/Дапамога пачаткоўцам}} паказваюць прыналежнасьць да нейкай групы ўдзельнікаў.

# Зносіны зь іншымі карыстальнікамі Вікіпэдыі праз старонку «Мае гутаркі»

Старонка гутарак удзельніка – гэта месца, дзе Вы й іншыя ўдзельнікі маюць магчымасьць пакідаць паведамленьні, на якія можна адказваць. Многія ўдзельнікі пакідаюць прывітаньні для новых карыстальнікаў. Іншыя вікіпэдысты могуць выкарыстоўваць гэтую прастору, каб пачаць размову, пазнаёміцца з Вамі лепей і зразумець зьмены, якія Вы зрабілі ў артыкулах.

- Шаблон {{Бабілёнская вежа}} паказвае ўзровень валоданьня аўтарам пэўнымі мовамі. Напр., {{#babel:be-N|ru-4|uk-4|en-2|bg-1|it-1}}
- Часам вікіпэдысты ставяць шаблёны, якія адлюстроўваюць статыстыку, напр., {{Славянскія разьдзелы Вікіпэдыі}} і {{Змаганьне Вікіпэдыяў}}, або сьпіс заданьняў: {{Заданьні для ўдзельнікаў}}.



*О, хтосьці пакінуў паведамленьне на маёй старонцы абмеркаваньня. У ім тлумачыцца, што мае выпраўленьні былі адмененыя, бо я не спасылалася на крыніцы.*
*З тае прычыны, што факт, які я дадала, падмацоўваецца на вэб-сайце ўраду, я зраблю рэдагаваньне нанова.*
*Гэтым разам я ўключу крыніцу ў разьдзел спасылак у канцы артыкулу.*

# Карыстальніцкі інтэрфэйс






**«Дапамога»** дазволіць Вам даведацца больш пра тое, як працуе Вікіпэдыя.

У «**Апошніх зьменах»** ёсьць сьпіс зьменаў, якія былі зробленыя ўва ўсіх артыкулах Вікіпэдыі ў храналягічным парадку. Гэтая старонка дазваляе выяўляць артыкулы з памылкамі і акты вандалізму.

**«Інтэрвікі».** Гэта функцыя зьвязвае адзін артыкул на розных мовах. Вікіпэдыя існуе на больш як на 280 мовах.

З дапамогай «**Пошуку»** Вы знойдзеце артыкул паводле Вашага запыту. Калі артыкул яшчэ не існуе, будзе адлюстраваны сьпіс артыкулаў, у якіх гэтае слова прысутнічае.

**«Стварэньне рахунку»** ў верхнім правым куце старонкі дае Вам доступ да ўсіх прыладаў Вікіпэдыі й дапамагае стварыць свой онлайнавы рахунак.

**«Форум»** – гэта адмысловае месца для камунікацый удзельнікаў вікіпэдыйнай супольнасьці. Тут Вы можаце абмеркаваць тэхнічныя і арганізацыйныя пытаньні Вікіпэдыі.

# Разгляд закладак на старонцы артыкулу

Асноўныя панэлі дзеяньняў з артыкулам зьмяшчаюцца ўверсе справа.

Панэль **«Рэдагаваць»**. Заўважылі недарэчнасьці?
Будзьце рашучымі – націсьніце на панэль і палепшыце артыкул.




Панэль **«Рэдагаваць крыніцу»**. Клікнуўшы на панэль, Вы атрымаеце пашыраныя магчымасьці рэдагаваньня, трапіўшы ў крынічны код вікі-разьметкі, якая мала чым адрозьніваецца ад стандартнага HTML-коду. Прыклады працы з кодам глядзіце ніжэй.




Даведайцеся больш – націсьніце **«Гісторыя»** і высьветліце, як артыкул разьвіваўся да цяперашняга стану. Старонка гісторыі таксама дазваляе праглядзець і параўнаць мінулыя вэрсіі артыкулу.



Старонка **абмеркаваньня** зьяўляецца месцам для абмеркаваньня аўтарамі й іншымі ўдзельнікамі плянаў, датычных структуры артыкулу. Тут адбываюцца размовы й дасягненьні кансэнсусу адносна зьместу артыкулу.
Гэта месца, дзе можна папрасіць дапамогі ў пытаньні, зьвязаным з гэтым артыкулам. Таксама, калі Вы ня хочаце дапісваць артыкул самастойна, націсьніце «Абмеркаваньне» і напішыце свае ідэі ды прапановы на старонцы гутарак.

*Я мару пра паляпшэньне якога-небудзь артыкулу, які потым зьявіцца на галоўнай старонцы вэб-сайту зь мільёнамі чытачоў.*






# Стварэньне артыкулаў

Існуе **шмат тэмаў, не закранутых артыкуламі** ў Вікіпэдыі. Калі Вы знайшлі такую, пашукайце спачатку іншыя варыянты назвы гэтай тэмы. Таксама праверце, ці закранаецца дадзеная тэма ў артыкуле сумежнай тэматыкі. Напрыклад, інфармацыя пра пэўны востраў можа быць прыведзеная ў артыкуле пра краіну, якой ён належыць.

Калі тэма сапраўды не закранутая ў Вікіпэдыі, дык гэта можа быць ад таго, што яна занадта нязначная й малавядомая, каб пісаць пра яе ў Вікіпэдыі, як, прыкладам, музычны гурт з найбліжэйшага гаражу альбо нічым не прыкметная асоба, якая вядзе блог.

Калі ж Вы лічыце, што тэма ўсё ж не павінна быць абмінутай у Вікіпэдыі, прыступайце да стварэньня адпаведнага новага артыкулу.

Кароткая спасылка

ВП:КВД

Дапільнуйце, каб замест кірылічных літараў **а, В, е, і, К, М, о, р, с, Т, у, х, Н** у тэкст ня трапілі адпаведныя лацінічныя.

# Агляд крыніц па тэме артыкулу

**Артыкулы Вікіпэдыі павінны грунтавацца на надзейных, бесстароньніх, апублікаваных крыніцах з рэпутацыяй хуткаправяральных і дакладных.** Гэта азначае, што Вікіпэдыя зьмяшчае меркаваньні толькі вартых даверу аўтараў, а ня погляды вікіпэдыстаў, якія прачыталі матэрыял і інтэрпрэтавалі яго на свой лад.

Слова ***крыніца*** мае ў Вікіпэдыі тры значэньні:

- уласна частку твору (артыкулу, дасьледаваньня, дакумэнту, кнігі);
- аўтара твору (напрыклад, пісьменьніка);
- выдаўца твору (напрыклад, «Наша Ніва» ці выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя імя П. Броўкі»).

Усе тры пералічаныя чыньнікі могуць уплываць ўзровень надзейнасьці крыніцы. З гэтай прычыны вартымі даверу крыніцамі могуць быць апублікаваныя матэрыялы з вартым даверу працэсам апублікаваньня; гэта могуць быць і аўтары, якія заслужылі аўтарытэт у апісаньні асобы, пра якую вядзецца; або і першае, і другое.

Калі Вы жадаеце дадаць новы артыкул, варта пашукаць адпаведныя крыніцы, што будуць утрымліваць тую інфармацыю, якую будзе раскрываць артыкул. **Як мінімум, варта знайсьці дзьве крыніцы, а лепей – чатыры-пяць.**

**Перад даданьнем артыкулу абавязкова паглядзіце, ці існуе ўжо такі**, выкарыстоўваючы сынанімічныя назвы ў пошуку. Гэта можна зрабіць у стандартным пошукавіку або праз убудаваны пошук у Вікіпэдыі.

**Калі артыкул ужо існуе**, магчыма, Вы можаце дадаць новыя зьвесткі, дапоўніць ці скарэктаваць існы артыкул. **Калі артыкул не існуе**, Вы пабачыце загаловак артыкулу ў выглядзе **чырвонай спасылкі**. Націсьніце на яе, і адчыніцца вакно стварэньня новага артыкулу.

На старонцы рэдагаваньня Вы можаце сьмела пісаць тэкст артыкулу (можаце загадзя падрыхтаваць тэкст, напрыклад, у нататніку, і потым толькі перанесьці ды аформіць яго на старонцы стварэньня). Не забывайцеся націскаць **«Захаваць старонку»** пасьля сканчэньня чарговага рэдагаваньня (перад захаваньнем зьменаў можна націснуць на **«Праглядзець»**, каб убачыць, як старонка будзе выглядаць пасьля захаваньня).

Артыкулы, меншыя за 3 тысячы знакаў, лічацца **накідамі**. Такія артыкулы маюць права на існаваньне, але патрабуюць разьвіцьця.

Калі артыкул не раскрывае зьместу зьявы, аб’екту, падзеі, яго могуць хутка выдаліць. Каб такога ня здарылася, паляпшайце свой артыкул і выкарыстоўвайце шаблён **{{Рэдагую}}**. Таксама не адмаўляйцеся ад адстойваньня права артыкула на існаваньне ў выпадку, калі яму будзе пагражаць выдаленьне.

Каб зрабіць тэкст лёгкім і зручным для чытаньня на старонках Вікіпэдыі, неабходна азнаёміцца і вывучыць базавыя правілы **вікі-фарматаваньня** *(глядзіце разьдзел «Вікі-разьметка»)*.

Таксама праглядзіце, як аформленыя і пабудаваныя артыкулы на тэмы, блізкія да Вашай, і адфарматуйце свой падобным чынам.

Па магчымасьці дадайце ў артыкул спасылкі на іншыя існыя артыкулы Вікіпэдыі (імёны, назвы, зьявы). Менавіта на гіпэрспасылках і пабудаваная праца, пошук і распаўсюд ведаў у Вікіпэдыі.

**Ваш новы артыкул будзе добры, калі Вы будзеце памятаць пра тры пункты:**

- апісаньне зьявы, падзеі, асобы;
- прычына значнасьці абранай тэмы;
- спасылкі на надзейныя крыніцы інфармацыі па тэме.

Выкарыстоўвайце **шаблён {{Рэдагую}}**, калі актыўна займаецеся артыкулам. Гэта паслужыць сыгналам іншым вікіпэдыстам, што трэба пачакаць з яго актыўным выпраўленьнем.

Кароткая спасылка

Вікіпэдыя:Як стварыць новы артыкул

# Для пэрфэкцыяністаў

Яшчэ адзін варыянт стварэньня артыкулу – скарыстацца **«Пясочніцай»**. Рабіце сваю працу там датуль, пакуль артыкул ня будзе ўтрымліваць тры вышэй азначаныя элемэнты.

Каб трапіць у «Пясочніцу», Вам неабходна яе стварыць. Назва старонкі павінна мець наступны выгляд **Удзельнік:Назва рахунку ўдзельніка/Пясочніца**.

Можаце карыстацца гэтай старонкай, каб захоўваць на ёй сваю чарнавую працу. Калі Вы цалкам скончылі сваю працу над артыкулам, знайдзіце іншага ўдзельніка, якому будзе цікавая гэтая тэма, з запытам прарэцэнзаваць створаны Вамі артыкул.

Пасьля гэтага скарыстайцеся спасылкай «**Перанесьці**», якая месьціцца ў выпадаючым мэню каля поля пошуку, каб перанесьці зьмест Вашай пясочніцы ў адпаведны артыкул Вікіпэдыі.

На старонцы, якая ў выніку адчыніцца, абярыце элемэнт «**(Асноўная)**» у выпадаючым сьпісе «**Новая назва**», пасьля ўвядзіце адпаведную назву для артыкулу замест назвы Вашай пясочніцы, растлумачце, што Вы робіце, у полі «**Прычына**» і націсьніце на кнопку «**Перанесьці старонку**».



Калі назва артыкулу складаецца зь некалькіх словаў, **першая літара першага слова** заўжды вялікая, астатнія словы – праз прагал з малой літары (напр., *Таварыства беларускай школы*).

**Назоўны склон, адзіночны лік.** Акрамя выпадкаў, калі слова мае толькі множную форму, калі мае сэнс адрозьніць артыкул пра адзін аб'ект і пра сукупнасьць, групу аб'ектаў.

**Замежныя імёны і назвы** пажадана падаваць у беларускім напісаньні *(Уладзімер Жырыноўскі, а не Владимир Жириновский)*. Калі няма агульнапрынятага беларускага адпаведніка, можна пісаць арыгінальную форму, але на пачатку артыкулу (у дужках) пажадана даць прыклад вымаўленьня: *Linux (лінукс)*.

Калі назва адпавядае **некалькім (розным) сэнсам**, зьявам, аб'ектам – варта стварыць адну абагульняльную старонку з гэтай назвай і пералічыць там спасылкі на больш дэталёвыя. Назвы такіх старонак складаюцца з агульнай назвы плюс удакладненьне ў круглых дужках. Напрыклад, агульны артыкул: *Сыстэма* можа спасылацца на *Сыстэма (паліталёгія)*, *Сыстэма (матэматыка)* і да т. п.

Назвы артыкулаў пра нейкі **твор** – без дьзвюхкосься і без удакладняльнага слова: *Песьня пра зубра*, а не *паэма Песьня пра зубра* і ня *«Песьня пра зубра»*.

Ня трэба закладаць у назву **герархію** паняткаў, напрыклад: *Зборная Беларусі па хакеі*, а не *Беларускі хакей: зборная*.

Ня трэба ўжываць у назьве розныя **службовыя сымбалі** кшталту |, *, &, +, {, }, [, ].

## Узорная структура добрага артыкулу

**Добрыя і абраныя артыкулы** – тыя артыкулы, да ўзроўню якасьці якіх варта імкнуцца пры напісаньні свайго артыкулу. Напр., **добрыя артыкулы** павінны мець адносна высокі ўзровень якасьці, але, у адрозьненьне ад **абраных артыкулаў**, усе патрабаваньні да іх носяць больш мяккі характар.

У дадатак да агульных правілаў, датычных артыкулаў Вікіпэдыі, добрыя артыкулы павінны быць:

- **якасна складзенымі і арыгінальнымі:** напісанымі для Вікіпэдыі, а не скапіяванымі аднекуль; мова й стыль напісаньня павінны быць на добрым узроўні і ня ўтрымліваць відавочных памылак;
- **поўнымі:** раскрываць тэму ў поўным аб'ёме, улічваць самыя значныя факты і меркаваньні;
- **добра прапрацаванымі:** адлюстроўваць старанны і рэпрэзэнтатыўны агляд асноўнай літаратуры па тэме, калі большасьць самых значных сьцьверджаньняў можа быць правераная ў якасных і надзейных крыніцах, утрымліваць сьпіс літаратуры і зноскі.

- **утрымліваць зноскі на крыніцы інфармацыі** асноўных тэзісаў, фактаў, сьцьверджаньняў, якія могуць выклікаць недавер, а таксама ацэначных меркаваньняў па тэме артыкулу;
- **нэўтральнымі:** прадстаўляць меркаваньні справядліва і непрадузята;
- **стабільнымі:** калі зьмест артыкулу не зьяўляецца тэмай спрэчак і ў ім не вядзецца «вайны выпраўленьняў»;
- **з уводзінамі:** утрымліваць мінімум 3–4 сказы ўводзінаў, якія коратка раскрываюць тэму артыкулу;
- **структураванымі:** мець добра структураваную герархію разьдзелаў;
- **ілюстраванымі выявамі толькі зь ясным ліцэнзійным статусам:** павінны ўтрымліваць толькі вольныя выявы і/ці абгрунтаваную, мінімальна неабходную колькасьць fair-use выяваў, якія адпавядаюць крытэрам добрапрыстойнага карыстаньня;
- **закончанымі:** ня ўтрымліваць яўна недапісаных разьдзелаў;
- **суаднесенымі катэгарыяльна:** мець катэгорыі й інтэрвікі.

## Што рабіць пасьля стварэньня артыкулу



- **Стварыць перанакіраваньні** на назву створанага артыкулу, калі гэта патрабуецца.

Напр.:  артыкул створаны пад асноўнай назвай *«Янка Купала»*, дарэчным будзе стварыць перасылку *«Іван Луцэвіч»*.

- Націснуць на экране зьлева ад навастворанага артыкулу «**Дадаць спасылкі**» і паставіць спасылку на адпаведнік артыкулу зь вядомай Вам мовы (калі адпаведнік існуе ў іншым моўным разьдзеле). Гэта робіцца праз «**Інтэрвікі**» ў левай калонцы зьнізу.

- **Злучыць** створаны Вамі артыкул зь іншымі артыкуламі, у якіх згадваецца Вашая тэма.

## Даданьне катэгорыяў

**Катэгорыя** – адмысловая старонка, якая зьмяшчае сьпіс артыкулаў, што ўваходзяць у дадзеную катэгорыю. Туды трапляюць усе старонкі, у якіх пазначана гэтая катэгорыя, у альфабэтным парадку. Катэгорыі розьняцца ад простых артыкулаў тым, што перад іх назвай ідзе ключавое слова ***Катэгорыя***, напр.: *Катэгорыя:Беларускія літаратары.*

Катэгорыі граюць ролю **тэгаў**, якія дапамагаюць клясыфікаваць артыкулы паводле тэмаў.

Перад тым, як дадаць катэгорыю, неабходна пашукаць яе праз пошук Вікіпэдыі. Знайшоўшы патрэбную катэгорыю, Вы можаце дадаць яе ўнізе старонкі, напр. **[[Катэгорыя:Беларускія літаратары]]**. Калі Вы не знаходзіце патрэбнай катэгорыі, паспрабуйце пашукаць паводле словаў-сынонімаў. Калі ж патрэбнай катэгорыі не існуе, Вы можаце яе запачаткаваць, каб іншыя ўдзельнікі таксама маглі ёй карыстацца.

Не забывайцеся дадаваць артыкул прынамсі ў адну катэгорыю, тады яго будзе лягчэй знайсці.

# Вікі-разьметка

Для вылучэньня, аздабленьня тэксту рознымі стылямі і пазначэньня структуры тэксту ў Вікіпэдыі існуе спэцыяльная мова фарматаваньня – **вікі-фарматаваньне**.

У правым слупку табэлі паказваюцца магчымасьці, якія можна ўжываць у артыкулах Вікіпэдыі, а ў левым – тое, што трэба напісаць, каб зрабіць такое фарматаваньне.




## Апісаньне разьметкі

Націснуўшы **«Рэдагаваць крыніцу»**,
Вы атрымаеце пашыраныя магчымасьці
ў выпраўленьні  артыкулаў. Вось найгалоўнейшыя
інструкцыі для рэдагаваньня коду Вікіпэдыі:

| Вікі-разьметка | Выглядае як |
|---|---|
| ''курсіў'' | *курсіў* |
| '''тоўсты''' | **тоўсты** |
| '''''тоўсты курсіў''''' | ***тоўсты курсіў*** |
| == загаловак == (2 знакі раўнаньня)<br>=== падзагаловак === (3 знакі раўнаньня)<br>==== падзагаловак<br>(меншы шрыфт) ==== (4 знакі раўнаньня) | **загаловак**<br>**падзагаловак**<br>**падзагаловак (меншы шрыфт)** |
| [[Беларуская мова]], тэкст,<br>[[Беларуская мова\|адрозны ад спасылкі]] | Беларуская мова, тэкст, адрозны<br>ад спасылкі |
| спасылка на [[няісную яшчэ старонку]]<br>вылучаецца чырвоным колерам | спасылка на няісную яшчэ старонку<br>вылучаецца чырвоным колерам |
| спасылка на разьдзел артыкулу [[Беларусь#<br>Насельніцтва\|«Насельніцтва Беларусі»]] | спасылка на разьдзел артыкулу<br>«Насельніцтва Беларусі» |
| [https://www.facebook.com/<br>BelarusianWikipedia спасылка на вонкавы<br>сайт] | спасылка на вонкавы сайт |

| | |
|---|---|
| [[Катэгорыя:Войны Вялікага Княства Літоўскага]] | Артыкул будзе зьмешчаны ў катэгорыю «Войны Вялікага Княства Літоўскага» |
| * зрабіць сьпіс проста (сьпіс будзе маркіраваны, а не нумараваны)<br>** чым болей зорачак – глыбейшы водступ | • зрабіць сьпіс проста (сьпіс будзе маркіраваны, а не нумараваны)<br>• чым болей зорачак – глыбейшы водступ |
| # сьпіс з аўтаматычнай<br># нумарацыяй радкоў | 1. сьпіс з аўтаматычнай<br>2. нумарацыяй радкоў |
| [[Файл:Colosseum.jpg\|значак\|250пкс\|Выява з подпісам]] | <br>Выява з подпісам |
| <ref>Зьмяшчэньне зноскі пасьля тэксту </ref> | Пазначэньне крыніцы інфармацыі зноскай. Адначасова ўнізе патрэбна зьмясьціць шаблён {{Зноскі}}. |
| {{Крыніцы}} (або {{reflist}}, або {{Зноскі}}) | Нумараваны сьпіс крыніцаў і зносак (дадаецца напрыканцы артыкулу) |
| --~~~~ | Ваш подпіс з датаю (дадаецца толькі ў абмеркаваньнях артыкулаў) |

## Апісаньне рэдактара

- Перад захаваньнем рэдагаваньня карыстайцеся клявішай **«Праглядзець»**, каб пабачыць, як артыкул будзе выглядаць пасьля захаваньня.
- Пажадана (але не абавязкова) коратка апісваць кожнае рэдагаваньне ў ваконцы пад назваю **«Кароткае апісаньне зьменаў»**.

## Дапаможныя сродкі

- Для спрашчэньня рыхтаваньня тэксту ў Вікіпэдыі існуе адмысловая прылада – **вікіфікатар**. Вікіфікатар прызначаны для выпраўленьня тыпаграфікі (расстаноўкі двукосьсяў, працяжнікаў, непарыўных прагалаў і іншых знакаў паводле фармальных правілаў), афармленьня тэксту і паляпшэньня вікі-фарматаваньня.

- Для выпраўленьня агульных хібаў у клясычнай артаграфіі існуе г. зв. **тарашкевізатар**. Шукайце яго ў сваіх наладах у сэкцыі **«Рэдагаваньне артыкулаў»** (даступна толькі для зарэгістраваных удзельнікаў).

Кароткія спасылкі на карысныя старонкі (шукаць праз пошук у Вікіпэдыі)

Вікіпэдыя:Вікі-фарматаваньне

Вікіпэдыя:Памятка

Вікіпэдыя:Як рэдагаваць існуючы артыкул

# Заліцьцё здымкаў (праект Wikimedia Commons)

Каб Ваш артыкул быў больш цікавы, Вы можаце дадаць у яго малюнак, відэа або гук. Уся інфармацыя ніжэй датычыцца ўсіх трох абазначаных тыпаў кантэнту.

Мэдыякантэнт можна дадаваць у кожным моўным разьдзеле Вікіпэдыі, але тады файл можна будзе ўжываць толькі ў тым моўным разьдзеле, у якім ён быў створаны.

Каб адзін і той жа файл выкарыстоўваць у розных моўных разьдзелах, трэба дадаць яго ў **ВікіСховішча (Wikimedia Commons)**, разьмешчанае па адрасе **commons.wikimedia.org** (мова сайту – ангельская).



Перш за ўсё рабіце свае малюнкі.

# Як дадаць мэдыякантэнт у ВікіСховішча

- Калі Вы ўжо стварылі рахунак у Вікіпэдыі, тады **залагіньцеся** ў **Wikimedia Commons**.
- **Націсьніце** кнопку **Upload**.
- Адкрыецца старонка з заўвагамі, як дзеяць, каб не парушыць аўтарскіх правоў на мэдыякантэнт. Прачытайце. Націсьніце **Next**.
- **Абярыце мэдыяфайл(ы)** для запампоўваньня.
- Пазначце **аўтарскія правы** на файлы.
- Дадайце **назву і апісаньне** мэдыякантэнту, дадайце катэгорыі.
- **Мэдыяфайл запампаваны!** Нарэшце Вы можаце скапіяваць код вікі-разьметкі, каб дадаць файл у Ваш артыкул.

Назва выявы звычайна разьмяшчаецца ў левым куце. Скапіюйце яе для таго, каб разьмясьціць на старонцы артыкулу.





This site requires you to provide copyright information for this work, to make sure everyone can legally reuse it.

◉ **This file is my own work.**

I, Mr. Zabej , the copyright holder of this work, irrevocably grant anyone the right to use this work under the following license:

- ◉ Creative Commons Attribution ShareAlike 4.0 (legal code)
- ○ Creative Commons Attribution ShareAlike 3.0 (legal code)
- ○ Creative Commons Attribution 4.0 (legal code)
- ○ Creative Commons Attribution 3.0 (legal code)
- ○ Creative Commons CC0 Waiver (release all rights, like public domain: legal code)

Магчымыя варыянты ліцэнзіяў для вашага твору ў Wikimedia Commons.

Learn | Upload | Release rights | Describe | **Use**

**Thanks for uploading!**

You can now use these files on wikis, or link to them on the web.



Белы наліў.jpg

To use the file in a wiki, copy this text into a page:

[[File:Белы наліў.jpg|thumb|These are typical belarusian apples.]]

To link to it in HTML, copy this URL:

https://commons.wikimedia.org/wiki/File:%D0%91%D0%B5%D0%BB%D1%8B_%D0%BD%D0%B0%D0

Пасьля праходжаньня ўсіх крокаў запампоўваньня Вашага кантэнту Вы атрымліваеце магчымасьць адразу скапіяваць код для свайго артыкулу.

# Заліцьцё малюнкаў

> Запампоўваючы выяву, відэа або гук у Вікіпэдыю, зважайце на балянс якасьці, памеру і вагі файлу.

## Як правільна зрабіць малюнак

Найбольш распаўсюджаныя памылкі:

- Дрэнная якасьць малюнку (ня бачны, расплываецца аб’ект).
- Абрэзка значных дэталяў аб’екту.
- Адцягваньне ўвагі ад аб’екту прысутнасьцю асоб, жывёлы ці іншых аб’ектаў.

**Увага:** выява перад запампоўваньнем не павінна ўтрымліваць ніякіх вадзяных знакаў. Пажадана запампоўваць выяву бяз штучна напісанага тэксту.

## Як правільна даць назву файлу з выявай

Лепей замест назвы файлу *Africa.png* выкарыстоўваць больш дэталёвыя назвы, напр., *Africa political map Jan. 2012.png* або *Africa political map with red borders.png*

## Якія фарматы файлаў прыдатныя для выяваў

Найбольш распаўсюджаныя і рэкамэндаваныя фарматы ў Вікіпэдыі: першы паводле папулярнасьці **jpeg** *(самы кампактны)* – 84 %, **png** *(зручны, калі ў вас празрыстая аснова, фон)* – 7 %, а трэці – **svg** *(зручны для мапаў і лягатыпаў)* – 5 %. Але магчымыя й іншыя незапатэнтаваныя фарматы: **pdf**, **tiff**, **ogg**, **djvu** і іншыя.

## Якія памеры файлаў аптымальныя для выяваў



Рэкамэндаваны **максымальны памер** заладаванага файлу на Wikimedia Commons – **100 мэгабайтаў** *(выключныя выпадкі 1 гігабайт)*, але, напр., малюнак лепей за ўсё рабіць да мэгабайта – памерам, прыдатным для прагляду аб'екту і значных дэталяў на ім.

НЕ ЗЬМЯШЧАЙЦЕ Ў ВІКІПЭДЫЮ ВЫЯВЫ, АЎТАРСТВА І ЎМОВАЎ РАСПАЎСЮДУ ЯКІХ ВЫ НЯ ВЕДАЕЦЕ!

## Парады па апісаньні выявы

Абавязковыя палі:

- **Апісаньне (Description)** – можаце спаслацца на артыкул, дзе будзеце дадаваць фота/гук/мэдыя, або растлумачце больш дэталёва, што і хто на фота (падзея, дата, дзейныя асобы). Апісаньне на ангельскай мове вельмі пажаданае.
- **Месца, дзе ўзялі (Source):** Імя стваральніка або дакладны URL, адкуль узялі фота (пажадана шлях менавіта да выявы). Калі фота ўзялі з кнігі (часопісу), пажадана пазначыць аўтара кнігі, ISBN, назву і год выданьня.
- **Аўтар (Author):** Пазначаць у любым выпадку.
- **Дазвол (Permission):** Які закон або дакумэнт дазваляе выкарыстаньне матэрыялу.
- **Дата (Date):** Поўная дата лепей, чым проста год.

Увага! У Вікіпэдыі нельга выкарыстоўваць запатэнтаваныя фарматы кшталту: MP3, AAC, WMA, MPEG і большасьць AVI. Калі Вы маеце кантэнт у непрымальным фармаце, пераканвэртуйце файл у вольны фармат.

## Як дадаць чужы малюнак

Неабходна атрымаць дазвол. Рэкамэндуецца выкарыстоўваць пісьмовую форму дазволу, якую трэба даслаць на адрас: **permissions-commons@wikimedia.org**, пажадана з адрасу аўтара, або ўлучыць яго ў копію ліста.

Калі будзеце працаваць не з уласнымі выявамі, варта:

- **распавесьці** аўтару, што такое Вікіпэдыя;
- **пазначыць малюнак**, які Вы жадаеце разьмясьціць (са спасылкай);
- **пазначыць**, дзе Вы хочаце разьмясьціць малюнак (са спасылкай);
- **запытаць дазвол** на разьмяшчэньне выявы пад умовамі грамадзкага набытку або вольнай ліцэнзіі, напр., *Creative Commons Attribution Share-Alike 4.0 International;*
- на старонцы выявы **пазначыць імя аўтара**, а таксама **спасылку**, адкуль узята фота;
- аддзячыць уладальніка выявы :-)

Кароткая спасылка на прыклад:

Вікіпэдыя:Запыт дазволаў на выкарыстаньне

# Разьмяшчэньне малюнкаў



Код генэруецца пасьля заліцьця выявы:
**[[Файл:Белы наліў.jpg|значак|Так выглядаюць звычайныя беларускія яблыкі.]]**
і дадаецца самастойна ў патрэбнае месца артыкулу.

Таксама можна дадаць выяву праз панэль рэдагаваньня артыкулу, якая месьціцца над асноўным полем уводу інфармацыі.

Назва файлу бярэцца з загалоўку на старонцы прагляду файлу.
Пасьля **Файл:Белы наліў.jpg** можна сьмела дадаваць праз рэдактар.

# Разьмяшчэньне галерэі

Дзеля дадаваньня галерэі неабходна выкарыстаць адмысловы тэг **<gallery>**, а таксама назвы файлаў выяваў зь **Wikimedia Commons**.

*Прыклад:*
**<gallery>**
Файл:Wiki.png|Подпіс 1
Файл:Wiki.png|Подпіс 2
**</gallery>**



Гэты тэг можна ўводзіць самому або праз графічны рэжым (абіраць у мэню рэдагаваньня).




## Пошук фота, відэа, аўдыё для Вашага артыкулу



- Шукайце малюнкі, якія знаходзяцца ў **грамадзкім набытку** *(public domain)* або выкарыстоўваюць вольныя ліцэнзіі *(напр.,* ***Creative Commons Attribution Share-Alike 4.0****)* у Сеціве.
- Шукайце малюнкі **на дзяржаўных сайтах**.
- Шукайце малюнкі ў Вікіпэдыі **ў адпаведных артыкулах** на іншых мовах або заходзьце на Wikimedia Commons і корпайцеся там.
- **Матывуйце** іншых вікірэдактараў дапамагчы Вам.

Калі Вы не знайшлі малюнку, але вельмі хочацца разьмясьціць, **пастаўце заглушку**. Гэта будзе заклікам да іншых вікі-жыхароў дапамагчы пашукаць, або распачніце на старонцы абмеркаваньня тэму пошуку малюнку.

# Як кантактаваць зь вікі-супольнасьцю Беларусі




**Група карыстальнікаў Вікіпэдыі** – гэта арганізаваная супольнасьць вікіпэдыстаў, якія жадаюць узаемадзеяць для больш актыўнага і эфэктыўнага разьвіцьця ведаў на беларускай мове.

| | |
|---|---|
| **Разьдзелы беларускай Вікіпэдыі існуюць двума правапісамі:** | |
| **клясычны *(тарашкевіца)* –** be-tarask.wikipedia.org | **афіцыйны *(наркамаўка)* –** be.wikipedia.org |
| **Сьпіс рассылак юзэргрупы** *– Тут апошнія навіны, цікавыя і карысныя спасылкі.* | |
| http://falanster.info/mailman/listinfo/wikification | |
| **Скайп-чаты** *(Калі жадаеце далучыцца да скайп-чатаў, пішыце ў мэйлінг ліст)* | |
| **Групы ў «Фэйсбуку»** | |
| facebook.com/BelarusianWikipedia | facebook.com/be.wikipedia |
| **Групы «Ўкантакце»** | |
| vk.com/belarusianwikipedia | vk.com/be.wikipedia |
| **Тўітэр** | |
| twitter.com/Wikipedyja | twitter.com/be_wikipedia |

# Ліцэнзіі матэрыялаў Вікіпэдыі CC BY-SA

**Што патрэбна ведаць аб правах на ўсе творы, малюнкі, выявы й іншыя матэрыялы, якія ўжо ёсьць ці якія Вы цяпер разьмяшчаеце ў Вікіпэдыі?**

Адна з умоваў карыстаньня Вікіпэдыяй – прававерныя паводзіны.
Паводле дзейных аўтарскіх правоў і іншых законаў можна:

- **чытаць і раздрукоўваць** артыкулы і іншыя мэдыя бескаштоўна;
- **рабіць унёсак і рэдагаваць** розныя сайты і праекты Вікімэдыі;
- **дзяліцца, распаўсюджваць і выкарыстоўваць** артыкулы й іншыя мэдыя пад вольнымі і адкрытымі ліцэнзіямі.

**Патрэбна:**
ліцэнзаваць увесь Ваш унёсак і зьмены на сайтах або праектах пад вольнай і адкрытай ліцэнзіяй *(калі Ваш унёсак не ў грамадзкім набытку)*.

## Чаму гэта важна?

Каб расло багацьце вольных ведаў і свабоднай культуры, усе карыстальнікі, якія ўдзельнічаюць у Вікіпэдыі, павінны прадстаўляць шырокія правы на свае творы грамадзкасьці, каб можна было

- паўторна распаўсюджваць і
- паўторна выкарыстоўваць унёсак свабодна,

так, каб такое выкарыстаньне было належным чынам

- прыпісана да аўтара і
- каб была такая ж свабода паўторнага выкарыстаньня і паўторнага распаўсюджваньня любых вытворных твораў.

**Менавіта таму абраныя вольныя ліцэнзійныя дагаворы,** умовы якіх найлепшым чынам адпавядаюць гэтай мэце.

*Што ж, час бяжыць. Я толькі што націснула на спасылку «Унёсак» уверсе старонкі й выявіла, што зрабіла ўжо больш за 100 рэдагаваньняў.*

*Я атрымала вялікае задавальненьне праз камунікацыю зь іншымі вікіпэдыстамі, напісаньне якасных артыкулаў і распаўсюджваньне ведаў, якія ўсім дасяжныя бясплатна.*

# Што такое вольныя ліцэнзіі?



Калі Ваш тэкст, малюнак, фота ахоўваюцца аўтарскім правам (ёсьць творамі) і Вы маеце на іх аўтарскія правы, Вы дадаяце іх на ўмовах ліцэнзіі **Creative Commons Attribution-ShareAlike** *(«CC BY-SA»)* і **GNU Free Documentation License** *(«GNU FDL»)*.

Значэньне літараў ліцэнзіі Creative Commons:

**CC – Creative Commons – Творчыя суполкі.** Адно з найбольш вядомых сямействаў публічных ліцэнзіяў, якія дазваляюць выкарыстоўваць творы, якія ахоўваюцца аўтарскім правам, у інтэрнэце.

**BY – Attribution – Прызначэньне аўтарства (Атрыбуцыя).** Гэта вельмі значная частка ліцэнзіяў. Тут мусіць пазначацца аўтар твору. Калі Вы ствараеце тэкст, Вы згодныя на тое, што Вашае аўтарства будзе пазначанае, часьцей за ўсё праз гіпэрспасылку (URL). Кожны артыкул мае старонку гісторыі, дзе пералічваюцца ўсе аўтары і рэдактары. Таксама, устаўляючы чужы тэкст, Вы павінны пазначыць аўтара (аўтараў) гэтага тэксту.

**SA – Share Alike – (Распаўсюд) на тых жа ўмовах.** Усё, што зьмяняецца, ствараецца на матэрыяле, які знаходзіцца пад вольнай ліцэнзіяй, таксама распаўсюджваецца пад той жа ліцэнзіяй Творчых суполак.

Вы можаце паўторна выкарыстоўваць кантэнт, які ўтрымліваецца ў Вікіпэдыі, у гэтым выпадку таксама неабходна, каб любое паўторнае выкарыстаньне адпавядала згаданым ліцэнзіям. Тое ж самае тычыцца любых зьменаў, дапаўненьняў тэкстаў або іншага кантэнту.

Вы маеце магчымасьць устаўляць тэкст, які знайшлі дзесьці яшчэ альбо напісалі ў суаўтарстве, але тады Вы гарантуеце, што ён даступны на тых умовах, якія не пярэчаць ліцэнзіі **CC BY-SA** або **GNU FDL**.

Нятэкставыя мэдыяфайлы могуць быць даступныя і пад іншымі ліцэнзіямі, галоўнае, што яны прытрымліваюцца мэты дазволу неабмежаванага паўторнага выкарыстаньня і паўторнага распаўсюджваньня. Памятайце аб гэтым, дадаючы нятэкставыя мэдыяфайлы.

Калі ласка, майце на ўвазе, што гэтыя ліцэнзіі дазваляюць камэрцыйнае выкарыстаньне Вашага ўнёску.

І нарэшце, нават калі Вы вырашылі ніколі больш не зьвяртацца да Вікіпэдыі, згодна ліцэнзіяў вы абяцаеце, што не скасуеце ў аднабаковым парадку і не паспрабуеце зрабіць несапраўднай любую ліцэнзію, якую Вы выдалі на свой тэкст альбо іншыя мэдыяфайлы ў Вікіпэдыі.

Ёсьць яшчэ кантэнт, які знаходзіцца ўжо ў **грамадзкім набытку**, г. зн. што ён можа выкарыстоўвацца без дазволу праваўладальніка і без выплаты ўзнагароды. Дадавайце смела! Аднак вельмі важна, каб Вы маглі пацьвердзіць гэты факт.



Ліцэнзіі Творчых суполак
GFDL
Філія Творчых суполак у Беларусі

# Кантакты

ФАЛАНСТЭР

falanster.by

falanster.by@gmail.com

# Стваральнікі брашуры:

Svetit, Mr. Zabej, Renessaince, Lady Di~bewiki, Liashko, Хомелка, Da voli, Hannabaradzina, Zmicier Sauka, Надежда Бутович, Base, @helaku, @czaroot, @romaiwanowa, @dinmoriarty, Ганна Лаўніковіч, @ritrita0312, @darya_sikorskaya

# Партнёры

Вікіпэдыя ня мае нязьменных правілаў.
**Будзьце рашучымі ў рэдагаваньні!**
Гэта пяты і самы важны слуп Вікіпэдыі!



ФАЛАНСТЭР 2015

bit.ly/wiki-helper-be-tarask

BY SA